**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ**
**ІНСТЫТУТ ЖУРНАЛІСТЫКІ**

**Кафедра стылістыкі і літаратурнага рэдагавання**

# Курсавыя працы па стылістыцы

**Вучэбна-метадычны дапаможнік**
**для студэнтаў факультэта журналістыкі**

Складальнікі:
Г. І. Басава, В. І. Дзесюкевіч, М. П. Цыбульская

Мінск
2009

Аўтары: **Басава Ганна Іванаўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
**Дзесюкевіч Вольга Іванаўна**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;
**Цыбульская Маргарыта Пятроўна**, старшы выкладчык Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Рэцэнзент – ***Іўчанкаў Віктар Іванавіч***, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

Вучэбна-метадычны дапаможнік
зацверджаны на пасяджэнні
кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання
Інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
16 лістапада 2009 г., пратакол № 4.

Рэкамендаваны Вучоным саветам Інстытута журналістыкі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
16 лістапада 2009 г., пратакол № 4 .

ЗМЕСТ

| | |
|---|---|
| Агульная характарыстыка працы | 4 |
| Этапы выканання курсавой працы | 5 |
| Структура працы (рубрыкацыя) | 6 |
| Выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў | 8 |
| Курсавая праца па стылістыцы | 9 |
| Лексікаграфічныя крыніцы (слоўнікі і даведнікі) | 11 |
| Тэматыка курсавых прац па стылістыцы | 18 |
| Афармленне курсавых прац | 51 |
| Дадатак 1 | 54 |
| Спіс выкарыстанай літаратуры | 55 |

# Агульная характарыстыка працы

У сучасную эпоху, эпоху глабальнай палітычнай, эканамічнай і культурнай інтэграцыі планеты, назіраецца перагляд як зместу, так і ролі адукацыі ў грамадстве. Адной з галоўных задач вышэйшай школы з'яўляецца павышэнне ўзроўню ведаў студэнтаў, выхаванне ў іх самастойнасці, творчага падыходу ў авалоданні навыкамі, фарміраванне навыкаў даследчай працы. У выкананні гэтай задачы значная роля адводзіцца такім яе формам працы, як курсавыя і дыпломныя працы, якія спалучаюць у сабе навучальны і навукова-даследчы складнікі.

Мэта курсавой працы – навучыць студэнтаў самастойна назіраць як за пэўнымі з'явамі, так і аналізаваць, тэарэтычна абагульняць адпаведны фактычны матэрыял, працаваць з навуковай літаратурай. Курсавая праца служыць праверкай умення выкарыстоўваць атрыманыя веды для вырашэння пэўнай навуковай задачы, выяўляе творчыя здольнасці студэнтаў.

На факультэце журналістыкі курсавая праца выконваецца студэнтамі дзённай і завочнай формаў навучання на II, III і IV курсах. Яна з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем тэкстаў масавай камунікацыі, у якім студэнт павінен прадэманстраваць тэарэтычныя веды, атрыманыя на факультэце журналістыкі падчас вывучэння як спецыяльных, так і агульнаадукацыйных дысцыплін. Акрамя таго, курсавая праца – адзін са шляхоў выпрацоўкі ў студэнтаў уменняў і навыкаў: вывучаць навуковую літаратуру, рабіць навуковыя назіранні, лагічна і паслядоўна выкладаць думкі ў пісьмовай форме, рабіць вывады і абагульненні, складаць спіс літаратуры, афармляць працу ў адпаведнасці з існуючымі стандартамі (правіламі і патрабаваннямі).

Курсавая праца павінна адпавядаць усім патрабаванням, якія прад'яўляюцца да навуковых тэкстаў. Падчас выканання курсавой працы студэнт павінен:

- ✓ абгрунтаваць актуальнасць, навізну і практычную значнасць праблемы;
- ✓ дакладна вызначыць аб'ект і прадмет даследавання;
- ✓ прадэманстраваць валоданне паняційным апаратам;
- ✓ правесці аналіз тэкстаў у аспекце заяўленай тэмы даследавання;

- ✓ рэалізаваць мэту і задачы даследавання, пастаўленыя ў пачатку работы;
- ✓ выявіць культуру навуковага выкладу тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу;
- ✓ зрабіць вывады, падагульненні вынікаў даследавання.

Курсавая праца павінна быць вытрымана ў навуковым стылі, што мае на ўвазе наяўнасць спецыяльнай тэрміналагізаванай лексікі; мінімальную ступень праяўлення асобаснага пачатку ў тэксце (абмежаванне выкарыстання эмацыянальна-ацэначнай лексікі, экспрэсіўнага сінтаксісу і інш.), лагічнасць выкладання. У працэсе работы неабходна карыстацца навуковай літаратурай і слоўнікамі.

Крытэрыямі ацэнкі курсавой працы з’яўляецца актуальнасць выбранай тэмы, глыбіня асваення матэрыялу, якасць падбору і выкарыстання крыніц, ступень самастойнасці вывадаў, агульная культура выкладу. Павінна быць праведзена грунтоўная праўка-вычытка. Наяўнасць арфаграфічных, пунктуацыйных і стылістычных памылак прыводзіць да зніжэння адзнакі.

## Этапы выканання курсавой працы

Спачатку студэнту неабходна выбраць тэму даследавання з прапанаванага спісу тэм (удакладненне і змена тэмы курсавой работы адбываецца толькі са згоды навуковага кіраўніка і загадчыка кафедры). Калі тэма, якая цікавіць студэнта, не адлюстравана ў спісе, неабходна звярнуцца з гэтым пытаннем да выкладчыка кафедры, які дапаможа сфармуляваць яе так, каб яна адпавядала праблематыцы кафедры.

Тэма курсавой працы не павінна быць вельмі шырокай і павінна адлюстроўваць прадмет даследавання (што аналізуецца) і аб’ект даследавання (дзе аналізуецца).

Пасля таго, як студэнт вызначыцца з тэмай, яму неабходна скласці бібліяграфічны спіс, размеркаваць яго па ступені прыярытэтнасці, асабліва вылучаючы тую літаратуру, якая ў далейшым будзе выкарыстана непасрэдна для напісання курсавой працы. Гэтыя навуковыя працы павінны быць прааналізаваны студэнтам. У бібліяграфічны спіс студэнт павінен уключыць:

а) навуковыя працы, якія непасрэдна тычацца тэмы даследавання;

б) літаратуру, звязаную з функцыянаваннем сродкаў масавай камунікацыі. У спіс можна ўвесці навуковую літаратуру міждысцыплінарнага характару (па журналістыцы, псіхалогіі, сацыялогіі, культуралогіі і інш.), неабходную для раскрыцця тэмы даследавання.

Пасля вывучэння навуковай літаратуры студэнт можа прыступаць да эмпірычных даследаванняў, гэта значыць непасрэдна да вывучэння тэкстаў абранага сродку масавай камунікацыі. Работа над курсавой працай прадугледжвае стварэнне не толькі бібліяграфічнай картатэкі, але і картатэкі прыкладаў. Прыклад павінен уяўляць сабой асобнае слова ці словазлучэнне, а таксама кантэкст ужывання – адзін ці некалькі сказаў, якія дазволяць раскрыць асаблівасці разглядаемага эмпірычнага матэрыялу. Прыклады, упарадкаваныя і дакладна пранумараваныя, могуць скласці дадатак (дадаткі) курсавой працы. Калі іх некалькі, то неабходна пранумараваць і ўключыць у змест курсавой працы.

## Структура працы (рубрыкацыя)

Неабходным этапам даследавання з’яўляецца складанне разгорнутага плана, які раскрывае змест працы, яе сутнасць і структурнае адзінства. Дэталёвы, прадуманы план адлюстроўвае сістэму і паслядоўнасць у выкладзе матэрыялу, канкрэтызуе напрамкі даследавання, аб’ядноўвае сузалежныя часткі, якія дапаўняюць, узаемаабумоўліваюць ход і логіку разважанняў.

Першапачатковы план курсавой працы акрэсліваецца падчас знаёмства з літаратурай па тэме і класіфікацыі фактычнага матэрыялу. Канчатковы варыянт плана ўдакладняецца / выяўляецца падчас напісання чарнавога варыянта. Неабходна памятаць, што фармулёўка назвы глаў, раздзелаў, параграфаў з’яўляецца сэнсавым ядром даследаванай з’явы. Назва дэманструе як аўтаномнасць, лагічную завершанасць кожнай часткі, так і яе суаднесенасць са зместам усяго даследавання.

Структурызацыю, рубрыкацыю прынята адлюстроўваць не толькі ў плане, але і ў змесце працы.

Курсавая праца традыцыйна складаецца з уступу, дзвюх (ці больш) глаў, заключэння, спісу выкарыстанай літаратуры, спісу выкарыстаных крыніц і бібліяграфічнага спісу. Работа можа змяшчаць дадаткі.

Работа пачынаецца з напісання **ЎСТУПУ**, у якім аўтар:

- аргументуе выбар тэмы даследавання, адзначаючы актуальнасць і практычную значнасць працы;
- аргументуе выбар крыніцы (СМІ, твор мастацкай літаратуры і інш.) і дае яе характарыстыку;
- фармулюе мэты і задачы даследавання.

Акрамя таго, уступ можа ўключаць агляд навуковай літаратуры па абранай тэме даследавання.

Асноўны змест курсавой працы складае аналіз і ацэнка сабранага і прыведзенага ў сістэму фактычнага матэрыялу, выяўленне характэрнага і спецыфічнага ў ім. Назіранні, разважанні аўтара прыводзяць да абагульненняў, вывадаў. Абгрунтаванымі, доказнымі з’яўляюцца тыя высновы, якія вынікаюць з непасрэднага аналізу фактаў, пацвярджаюцца тыповымі, характэрнымі прыкладамі.

**АСНОЎНАЯ ЧАСТКА ПРАЦЫ** звычайна складаецца з дзвюх глаў. Магчымы два варыянты пабудовы асноўнай часткі. Пры першым варыянце асноўная частка работы дзеліцца на тэарэтычную і практычную главы, дзе тэарэтычная глава ўяўляе сабой рэфератыўны агляд прачытанай навуковай літаратуры па абранай тэме, а практычная – адпаведны аналіз эмпірычнага матэрыялу, заснаваны на тэарэтычных палажэннях, апісаных у першай главе.

Другі варыянт прадугледжвае такую кампазіцыю працы, пры якой няма дакладнага дзялення на тэарэтычную і практычную главы. У межах кожнай з глаў спачатку апісваюцца тэарэтычныя палажэнні, а затым яны выкарыстоўваюцца пры аналізе прыкладаў з канкрэтных сродкаў масавай камунікацыі ці твораў мастацкай літаратуры. Менавіта ў гэтым выпадку трэба будзе правесці рубрыкацыю працы.

Курсавая праца павінна мець кальцавую кампазіцыю, гэта значыць у **ЗАКЛЮЧЭННІ** неабходна з улікам мэт і задач, сфармуляваных ва **ЎСТУПЕ**, зрабіць вывады па кожнай з глаў, абагульніць вынікі даследавання і, калі дазваляе матэрыял, даць практычныя рэкамендацыі, якія маглі б быць выкарыстаны ў журналісцкай дзейнасці.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ** ўключае толькі тыя навуковыя і даведачныя выданні (манаграфіі, вучэбныя дапаможнікі, навуковыя артыкулы, слоўнікі і інш.), на якія былі зроблены спасылкі ў курсавой працы.

У **БІБЛІЯГРАФІЮ** ўключаюцца спіс выкарыстанай літаратуры, а таксама тыя навуковыя і даведачныя выданні, якія былі прачытаны аўтарам пры падрыхтоўцы курсвой працы, але не цытаваліся ў самім даследаванні.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ** павінен уяўляць сабой пералік тых тэкстаў масавай камунікацыі ці твораў мастацкай літаратуры, якія былі прааналізаваны ў курсавой працы. (Гл. узор афармлення спісаў.)

## Выкарыстанне інтэрнэт-рэсурсаў

У наш час пры напісанні курсавой працы студэнты звычайна звяртаюцца да рэсурсаў сеткі інтэрнэт. Як паказвае практыка, не заўсёды магчымасці сеткі выкарыстоўваюцца згодна з прызначэннем і ў поўным аб'ёме. Часам студэнты ўключаюць у сваё даследаванне (цалкам ці фрагментарна) размешчаныя ў інтэрнэце тэксты без змен, каментару ці спасылак, што расцэньваецца як плагіят. Гэта не азначае, што не варта звяртацца да рэсурсаў сеткі інтэрнэт для атрымання звестак, якія дапамогуць у даследаванні. Неабходна толькі разумець, што і якім чынам можна выкарыстоўваць пры напісанні курсавой працы.

Электронныя адрасы бібліятэк можна знайсці дзякуючы пошукавым сістэмам, напрыклад www.tut.by; www.rambler.ru; www.yandex.ru; www.catalog.alledu.ru і іншым. Пры пошуку навуковай літаратуры можна карыстацца пошукавымі сістэмамі (Rambler, Yandex, Aport і інш.), дзе знаходжанне інфармацыі ажыццяўляецца па ключавых словах.

Неабходна ведаць, што атрыманая інфармацыя нераўназначная, таму пры адборы патрэбна звяртаць увагу на аўтара публікацыі, сайт, на якім размешчана інфармацыя, час публікацыі. Заслугоўваюць увагі і такія парталы, як www.philology.ru (рускі філалагічны партал), www.omsu.omskreg.ru («Вестник Омского университета»), www.jour.vsu.ru («Акценты. Новое в массовой коммуникации») – выданне факультэта журналістыкі Варонежскага дзяржаўнага універсітэта, http://cios.org/www/comweb.htm (тэксты па камунікацыі ў журналістыцы).

Матэрыялы, атрыманыя з сайтаў, выкарыстоўваюцца і афармляюцца ў курсавой працы ў адпаведнасці з правіламі цытавання тэкстаў на папяровых носьбітах.

## Курсавая праца па стылістыцы

Курсавая праца па стылістыцы выконваецца студэнтамі факультэта журналістыкі дзённай і завочнай формаў навучання на III курсе. Яна з'яўляецца самастойным навуковым даследаваннем тэкстаў масавай камунікацыі і твораў мастацкай літаратуры, у якім студэнт павінен прадэманстраваць тэарэтычныя веды і практычныя навыкі, атрыманыя на факультэце журналістыкі падчас вывучэння "Стылістыкі".

### МАГЧЫМЫЯ АСПЕКТЫ СТЫЛІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ

Пры стылістычным аналізе тэкстаў масавай камунікацыі і твораў мастацкай літаратуры асноўную ўвагу неабходна звярнуць на аналіз менавіта лінгвістычных асаблівасцей, аднак нельга забываць і пра экстралінгвістычныя фактары, якія ўплываюць на адбор тых ці іншых моўных сродкаў.

Да **экстралінгвістычных фактараў** адносяцца:

- прадмет і адлюстраваная сфера рэальнасці;
- камунікатыўная сітуацыя;
- асоба аўтара, яго сацыяльна-прафесійны статус, светабачанне;
- мэта выказвання (інфармаванне, выражэнне чыіх-небудзь інтарэсаў);
- від аўдыторыі, сфера яе дзелавой актыўнасці, тэрытарыяльная агульнасць, узрост, пол і інш.;
- тып выдання;
- жанр і інш.

Да **лінгвістычных аспектаў даследавання** можна аднесці, напрыклад, лексіка-граматычныя асаблівасці выданняў рознага тыпу ці мастацкага тэксту, сістэму маўленчых дзеянняў, прынятую ў аналізуемым сродку масавай камунікацыі, а таксама інтэртэкстуальнасць у медыятэкстах.

### Лексіка-граматычныя асаблівасці

Ідэйны і тэматычны змест розных сродкаў масавай камунікацыі і твораў мастацкай літаратуры знаходзіць выражэнне ў лексічных і граматычных катэгорыях. Пры стылістычным аналізе лексічнага ўзроўню тэксту можна звярнуць увагу на праблемы, звязаныя з выкарыстаннем у сучасных сродках масавай камунікацыі і твораў мастацкай літаратуры:

- ➢ архаізмаў і гістарызмаў;
- ➢ неалагізмаў і аказіяналізмаў;

- сінонімаў і антонімаў;
- мнагазначных слоў і амонімаў;
- дыялектызмаў, жарганізмаў, аргатызмаў, запазычаных слоў;
- тропаў і фігур маўлення і іх стылістычных функцый у кожным канкрэтным матэрыяле.

У курсавой працы можна таксама прааналізаваць праблемы, звязаныя з суадносінамі экспрэсіўных і стандартных элементаў у тэксце. Аналіз суадносін экспрэсіўных і стандартных элементаў дазваляе:

- ✓ вызначыць функцыі тэксту: перавага экспрэсіўных элементаў можа сведчыць аб уплывовым характары аналізаванага тэксту, а стандартных – аб яго інфарматыўнасці;
- ✓ ахарактарызаваць індывідуальныя стылістычныя асаблівасці асобнага аўтара (выдання, перадачы і інш.).

Так, напрыклад, тэкст, у якім пераважаюць экспрэсіўныя элементы (размоўная лексіка на фоне кніжнай ці нейтральнай, тропы, фразеалагічныя звароты, парцэляваныя канструкцыі, звароты, пабочныя і ўстаўныя словы і канструкцыі, якія выражаюць асобасны пачатак і інш.), можна ідэнтыфікаваць як уплывовы тэкст з ярка выражаным асобасным пачаткам.

**Сістэма маўленчых дзеянняў,**
**прынятая ў аналізуемым сродку масавай камунікацыі**

Любы сродак масавай камунікацыі аперырує традыцыйным для яго наборам маўленчых дзеянняў (каментары, інфармацыйныя паведамленні, апісанне, ацэнка, зварот да чытача, сентэнцыя і інш.), на якіх фарміруюцца жанравыя структуры. Стылістычны аналіз сістэмы маўленчых дзеянняў канкрэтнага сродку масавай камунікацыі прадугледжвае даследаванне, з аднаго боку, разнавіднасцей маўленчых дзеянняў, а з другога – асаблівасцей іх функцыянавання ў тэксце. Спецыфіка пэўнага сродку масавай камунікацыі адлюстроўваецца на выбары маўленчых дзеянняў, што выбіраюцца яго аўтарам для выражэння інфармацыі.

Падчас працы над курсавой працай студэнту неабходна вызначыць суадносіны маўленчых дзеянняў, арыентаваных на інфармаванне, і маўленчых дзеянняў, арыентаваных на ўздзеянне; з дапамогай якіх маўленчых дзеянняў у аналізуемым тэксце выражаецца ацэнка, у якія моманты і пры дапамозе якіх маўленчых дзеянняў яна выражаецца эксплііцытна, а ў якія імпліцытна; ці ёсць у

аналізуемым тэксце маўленчае дзеянне, якое можна лічыць стылеўтваральным элементам медыятэксту.

**Інтэртэкстуальнасць у тэкстах аналізуемага выдання**

Аналіз інтэртэкстуальнасці прадугледжвае выяўленне і апісанне:

- ✓ кола цытаваных крыніц (хто цытуецца і як часта);
- ✓ форм выражэння інтэртэкстуальнасці ў тэксце (цытаванне, пераказ, перадача “чужой” думкі, спасылкі на аўтарытэтныя крыніцы, прэцэдэнтныя тэксты ці іншыя формы, абумоўленыя асаблівасцю канкрэтнага сродку масавай камунікацыі);
- ✓ спосабаў трансфармацыі прэцэдэнтных тэкстаў;
- ✓ функцый цытаты ў канкрэтным сродку масавай камунікацыі: кантакт з чытачом (слухачом), моўная гульня і інш.

Працуючы над курсавым даследаваннем, студэнт можа выбраць адзін з аспектаў стылістычнага аналізу, сфармуляваўшы тэму наступным чынам: “Лексічныя асаблівасці газеты “Звязда” ці “Лексіка-граматычныя сродкі стварэння экспрэсіі ў газеце “Літаратура і мастацтва”, “Апісанне ў газеце “Чырвоная змена” і інш. Стылістычны аналіз сродкаў масавай камунікацыі прадугледжвае не толькі выяўленне і апісанне моўных і маўленчых асаблівасцей тэкстаў, але і вызначэнне камунікатыўнай задачы, якую яны павінны выконваць у тэксце, а таксама якасць рэалізацыі камунікатыўнай задачы.

## Лексікаграфічныя крыніцы (слоўнікі і даведнікі)

Распрацоўка тэарэтычнай часткі курсавога даследавання пачынаецца са знаёмства з адпаведнымі артыкуламі ***энцыклапедычных*** слоўнікаў. Сярод іх найбольш аўтарытэтнымі з’яўляюцца:

- ✓ *Беларуская мова: Энцыклапедыя* (пад рэд. А. Я. Міхневіча. – Мінск: БелЭн., 1994) – першае выданне такога тыпу ў гісторыі нацыянальнай культуры. У ім падаецца нямала звестак з беларусазнаўчага мовазнаўча-культуралагічнага сумежжа. Энцыклапедыя змяшчае дастаткова падрабязную характарыстыку катэгорый і законаў функцыянавання літаратурнай мовы, а таксама разнастайныя звесткі аб мове народна-

гутарковай у яе дыялектнай разгалінаванасці, мове выдатных беларускіх паэтаў і празаікаў. Разглядаецца і праблематыка культуры вуснага і пісьмовага маўлення, станаўленне і пашырэнне літаратурных норм у галіне правапісу, вымаўлення, стылістыкі. Энцыклапедыя змяшчае як артыкулы, прысвечаныя пэўным праблемам, так і персаналіі.

- ✓ *Лингвистический энциклопедический словарь* (под ред. В. Н. Ярцевой. – М., 2002) і *Русский язык* (под ред. Ю. Н. Караулова. – М., 2003). Акрамя артыкулаў, прысвечаных пэўным праблемам, да якіх дадаюцца даволі падрабязныя бібліяграфічныя спісы, гэтыя энцыклапедыі змяшчаюць персаналіі. Створаныя калектывамі аўтарытэтных вучоных, гэтыя энцыклапедыі вытрымалі некалькі перавыданняў.

Рэкамендуецца таксама звярнуць увагу на **энцыклапедычныя выданні *па стылістыцы***, якія выйшлі ў апошнія гады:

- ✓ *Энциклопедический словарь-справочник. Выразительные средства русского языка и речевые ошибки и недочеты* (под ред. А. П. Сковородникова. – М., 2005), які прысвечаны праблеме выразнасці маўлення. Стылістычныя фігуры і тропы, якія разглядаюцца ў першай частцы слоўніка, пададзены ў аспекце рэальнага функцыянавання ў маўленні. Сродкі выразнасці разглядаюцца як вынік прагматычна матываваных адступленняў ад нормы. Нематываваныя прагматычна адступленні (немэтазгодныя з пункту гледжання выразнасці) ацэньваюцца як маўленчыя памылкі. Другая частка слоўніка, прысвечаная маўленчым памылкам, скіравана на фарміраванне ўменняў аўтарэдагавання і актуальная найперш для студэнтаў спецыяльнасці «Літаратурная работа». Кожны артыкул мае невялікі бібліяграфічны спіс.
- ✓ *Стилистический энциклопедический словарь русского языка* (под ред. М. Н. Кожиной. – М., 2003), які выконвае функцыю слоўніка стылістычных тэрмінаў, вылучаецца даволі аб’ёмнымі бібліяграфічнымі спісамі да кожнага артыкула і мае практычную і тэарэтычную накіраванасць. Адлюстроўвае дынамічны інтэграцыйна-дыферэнцыйны працэс у навуцы: з’яўленне новых навуковых напрамкаў і дысцыплін і іх узаемадзеянне. “Перапляценне” стылістыкі з культурай маўлення, паэтыкай, прагматыкай, лінгвістыкай тэксту і тэорыяй маўленчых актаў, а таксама з псіхалінгвістыкай знаходзіць адлюстраванне ў адпаведных артыкулах энцыклапедычнага выдання, але

цэнтральнае месца ў гэтым слоўніку адводзіцца функцыянальнай стылістыцы.

✓ *Культура русской речи: Энциклопедический словарь-справочник* (под ред. Л. Ю. Иванова, А. П. Сковородникова, Е. И. Ширяева и др. (2-е изд.). – М., 2007) змяшчае дэфініцыі / тлумачэнні асноўных паняццяў тэорыі культуры маўлення, функцыянальнай стылістыкі і рыторыкі, а таксама звесткі пра большасць слоўнікаў рускай мовы. Згодна з канцэпцыяй аўтараў энцыклапедыі, праблематыка культуры маўлення (культуры валодання мовай) як дысцыпліны ахоплівае не толькі захоўванне нормаў мовы, але і выразнасць, эфектыўнасць маўлення. Адна з мэтаў выдання – дапамагчы даследчыкам сучасных тэкстаў масавай камунікацыі. Асноўнымі крыніцамі для прыкладаў сталі актуальныя тэксты СМІ. Значная частка слоўніка прысвечана пытанням эраталогіі (апісанню маўленчых памылак).

Сярод **лінгвістычных** адзначым найбольш вядомыя **тлумачальныя слоўнікі**. *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы* (5 т. Пад агульн. рэд. К. К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск, 1977–1984) з’яўляецца найбольш поўным сучасным даведнікам такога тыпу. У ім фіксуецца лексіка і фразеалогія беларускай мовы ХХ ст. З’яўляючыся нарматыўным даведнікам сучаснай беларускай літаратурнай мовы, слоўнік зыходзіць з аб’ектыўнага характару тых нормаў і жывых тэндэнцый, якія склаліся ў мове на працягу пяцідзесяці гадоў ХХ ст. на ўсіх узроўнях яе сістэмы – лексічным, фразеалагічным, акцэнтуацыйным, словаўтваральным і граматычным. Гэтыя асаблівасці робяць Тлумачальны слоўнік беларускай мовы аўтарытэтным і актуальным даведнікам.

«Унікальны помнік рускай мовы» (В. У. Вінаградаў), Толковый словарь живого великорусского языка У. І. Даля змяшчае больш за 200 000 слоў і 30 000 парэмій, але, як вядома, не з’яўляецца нарматыўным. Звяртацца да яго неабходна, калі ў курсавым даследаванні разглядаецца публіцыстычны твор XIX – пачатку ХХ стст. ці мастацкі, незалежна ад часу напісання.

*Толковый словарь русского языка* (под ред. Д. Н. Ушакова, 4 т., 85 000 слов) пачаў ствараццa ў 20-я гады ХХ ст. выдатным калектывам вучоных. У працы над слоўнікам удзельнічалі В. У. Вінаградаў, Р. В. Вінакур, Б. А. Ларын, С. І. Ожагаў, Б. В. Тамашэўскі. У слоўнік увайшла лексіка розных сфер ужывання (дыялектная, прастамоўная, прафесійныя і спецыяльныя тэрміны). Гэты слоўнік павінен быў вырашаць шматлікія задачы, бо, акрамя

тлумачэння значэнняў слова, утрымліваў інфармацыю аб вымаўленні, напісанні, этымалогіі, граматычных асаблівасцях і стылістычных уласцівасцях слоў. Гэты нарматыўны слоўнік быў накіраваны на прадухіленне памылковага словаўжывання. У 2005 годзе было выдадзена перапрацаванае і дапоўненае выданне – *Толковый словарь современного русского языка* (Д. Н. Ушаков; под ред. Н. Ф. Татьянченко, 110 000 словарных статей), у якім захаваліся асноўныя лексікаграфічныя прынцыпы першапачатковага слоўніка. Былі ўключаны новыя словы, якія сталі ўжывацца ў літаратурнай мове ў апошнія дзесяцігоддзі, зменены тлумачэнні слоў, адрэдагаваны ілюстрацыйныя прыклады.

Першы кароткі нарматыўны тлумачальны слоўнік рускай мовы – *Словарь русского языка* (С. И. Ожегов, с 1972 г. – под ред. Н. Ю. Шведовой) – адлюстроўвае актуальны лексіка-фразеалагічны фонд мовы. За межамі слоўніка засталася прафесійная і дыялектная лексіка. Ілюстрацыі значэнняў лаканічныя і выразныя. Найбольш папулярны тлумачальны слоўнік рускай мовы.

*Словарь современного русского языка (БАС)* (17 т., М., Л., 1948–1965) ахоплівае лексіку рускай літаратурнай мовы з канца XVIII ст. да яе сучаснага стану, адлюстроўвае развіццё мовы пачынаючы з пушкінскіх часоў. Накіраваны на ўсебаковую семантычную, стылістычную і граматычную характарыстыку слова, яго фразеалагічнага акружэння, стылістычнага ўжывання. Акрамя таго, апісваюцца асаблівасці правапісу, вымаўлення і словаўтваральныя магчымасці слова. Слоўнікавы артыкул вылучаецца багатай ілюстрацыйнай зонай, а таксама найбольш тонка дыферэнцыяванай сістэмай стылістычных паметаў. Апошняя асаблівасць вызначае БАС як слоўнік павышанай нарматыўнасці. З 2004 года пачаў перавыдавацца пад назвай *Большой академический словарь русского языка*.

*Словарь русского языка (МАС)* (4 т. Под ред. А. П. Евгеньевой, вт. изд. – 1981–1984 испр. и доп., все последующие – стереотипные) з'яўляецца нарматыўным слоўнікам, якая змяшчае лексіку рускай літаратурнай мовы ад Пушкіна да сучаснасці, ілюстраваную прыкладамі з мастацкай літаратуры. Мэтай было прадставіць частку шырокаўжывальнай лексікі рускай літаратурнай мовы, неабходную для чытання класічнай і сучаснай літаратуры.

*Толковый словарь русского языка конца XX века. Языковые изменения* (под ред. Г. Н. Скляревской. – СПб., 1998) дазваляе ўявіць, як у мове

адлюстраваліся змены ў грамадстве, якія адбываліся на працягу двух апошніх дзесяцігоддзяў XX стагоддзя. Акрамя тлумачэння семантыкі слова і ілюстрацыі словаўжывання, у слоўнікавым артыкуле можа прыводзіцца і некаторая энцыклапедычная інфармацыя.

*Современный толковый словарь русского языка* (под ред. С. А. Кузнецова. Более 90 000 слов и фразеологических выражений. – СПб., 2004) дае рознааспектную характарыстыку слоў (напісанне, вымаўленне, паходжанне, словазмяненне, сфера функцыянавання, значэнне, спалучальнасць) усіх стылістычных пластоў і літаратурных жанраў, у якіх функцыянуе сучасная руская мова. Семантычная структура мнагазначных слоў і граматычныя формы пададзены дакладна. Ілюстрацыйны матэрыял мінімальны.

Карысным даведнікам па пытаннях правапісу, вымаўлення і змянення слоў з’яўляецца *Слоўнік беларускай мовы. Арфаграфія. Арфаэпія. Акцэнтуацыя. Словазмяненне (пад рэд. М. В. Бірылы. – Мінск, 1987)*, які найбольш поўна ахоплівае лексіку сучаснай беларускай літаратурнай мовы, адлюстроўвае адрозненні ў напісанні і вымаўленні слоў, паслядоўна дае розныя граматычныя формы зменных часцін мовы. Слоўнік садзейнічае павышэнню культуры беларускай літаратурнай мовы, дазваляе атрымаць з адной крыніцы неабходныя звесткі пра напісанне і вымаўленне пераважнай большасці слоў, месца націску ў зыходных словах і іх формах, самі гэтыя формы, што існуюць у беларускай літаратурнай мове і ў наш час.

Зразумела, выконваючы даследаванне па канкрэтный тэме, студэнт вымушаны звяртацца да вялікай колькасці іншых лексікаграфічных крыніц у залежнасці ад матэрыялу даследавання. Напрыклад, для тых, хто вывучае стылістычныя асаблівасці сучаснай рускай публіцыстыкі, будзе цікавы слоўнік Р. Я. Салганіка *Стилистический словарь публицистики* (М., 1999), а для тых, хто займаецца паэтычным тэкстам, – *Словарь языка русской поэзии XX века* (отв. ред. В. П. Григорьев, 2001). Разумеючы немагчымасць разглядаць вялікую колькасць слоўнікаў, рэкамендуем карыстацца парадамі свайго навуковага кіраўніка і звяртацца да лексікаграфічных сайтаў, такіх як www.gramota.ru і www.oomnik.ru, на якіх размешчаны слоўнікі on-line.

У адпаведнасці з тэмай даследавання аўтару курсавой працы неабходна звяртацца да самых розных лексікаграфічных крыніц, спіс якіх падаем ніжэй.

Абабурка, М. В. Беларускае слова і яго вывучэнне / М. В. Абабурка. – Мінск, 1986.

Абабурка, М. В. Развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры / М. В. Абабурка. – Мінск, 1987.

Абабурка, М. В. Параўнальная граматыка беларускай і рускай моў / М. В. Абабурка. – Мінск, 1992.

Арашонкава, Г. У., Лемцюгова, В. П. Кіраванне ў беларускай і рускай мовах: Слоўнік-даведнік / Г. У. Арашонкава. – Мінск, 1991.

Арашонкава, Г. У., Лемцюгова, В. П. Слоўнік цяжкасцей беларускай мовы / Г. У. Арашонкава. – Мінск, 1987.

Асновы культуры маўлення і стылістыкі / Пад рэд. У. В. Анічэнкі. – Мінск, 1992.

Беларуская мова: Цяжкія пытанні фанетыкі, арфаграфіі, граматыкі / Пад рэд. А. І. Падлужнага. – Мінск, 1987.

Беларуская граматыка: У 2-х ч. – Мінск, 1985. – Ч. 1; 1986. – Ч. 2.

Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы. 3-е выд. // Склад. Ф. Янкоўскі. – Мінск, 1992.

Гаўрош, Н. В. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы / Н. В. Гаўрош. – Мінск, 1991.

Грабчиков, С. М. Межъязыковые омонимы и паронимы / С. М. Грабчиков. – Мінск, 1980.

Киселев, И. А. Русско-белорусский фразеологический словарь / И. А. Киселев. – Мінск, 1991.

Клышка, М. Е. Слоўнік сінонімаў і блізказначных слоў / М. Е. Клышка. – Мінск, 1993.

Лепешаў, І. Я. Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў / І. Я. Лепешаў. – Мінск, 1981.

Лепешаў, І. Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы: У 2 т. / І. Я. Лепешаў. – Мінск, 1993.

Плотнікаў, Б. А., Антанюк, Л. А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б. А. Плотнікаў. – Мінск, 2003.

Рагойша, В. П. Паэтычны слоўнік / В. П. Рагойша. – Мінск, 1987.

Санько, З. Малы беларуска-рускі слоўнік прыказак, прымавак і фразем / З. Санько. – Мінск, 1991.

Сцяцко, П. У. Культура мовы / П. У. Сцяцко. – Мінск, 2002.

Сцяцко, П. У. Беларускае нарднае словаўтварэнне / П. У. Сцяцко. – Мінск, 1977.

Сцяцко, П. У. Народная лексіка і словаўтварэнне / П. У. Сцяцко. – Мінск, 1972.

Шакун, Л. М. Словаўтварэнне / Л. М. Шакун. – Мінск, 1978.

Шкраба, І., Шкраба, Р. Крынічнае слова / І. Шкраба. – Мінск, 1987.

Шкраба, І. Самабытнае слова: Слоўнік беларускай безэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І. Шкраба. – Мінск, 1994.

Этымалагічны слоўнік беларускай мовы: У 8 т. – Мінск., 1978–1993. Т. 1–8.

Янкоўскі, Ф. Беларуская фразеалогія. Фразеалагізмы, іх значэнне, ужыванне / Ф. Янкоўскі. – Мінск, 1968.

# Тэматыка курсавых прац па стылістыцы

## Стылістычнае выкарыстанне лексічных і фразеалагічных сродкаў мовы

### Засваенне і стылістычнае выкарыстанне запазычанай лексікі

- Запазычанні з англійскай мовы ў матэрыялах спартыўнай тэматыкі.
- Месца і стылістычныя функцыі запазычанняў у сферы маладзёжнай субкультуры.
- Фанетычная адаптацыя запазычанняў у сучаснай беларускай мове.
- Запазычаная лексіка сферы інфармацыйных тэхналогій.
- Новыя запазычанні ў палітычным дыскурсе.

*Літаратура*


Булыка, А. М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове: XIV–XVIII стст. / А. М. Булыка. – Мінск, 1980.

Бубновіч, Б. І. Засваенне іншамоўных слоў беларускай літаратурнай мовай: дапам. для студ. філал. спец. ВНУ / Б. І. Бубновіч. – Гродна, 2000.

Валгина, Н. С. Активные процессы в современном русском языке / Н. С. Валгина. – М., 2003.

Давыдова, О. А. Заимствования-аббревиатуры в языке современных средств массовой коммуникации / О. А. Давыдова // Язык современной публицистики: сб. ст. / Сост. Г. Я. Солганик. – М., 2007. – С. 212–231.

Даўгулевіч, Н. М. Блокбастэр, трылер, джангл: Новая запазычаная лексіка сферы культуры / Н. М. Даўгулевіч // Роднае слова. – 2003. – № 7. – С. 38–40.

Даўгулевіч, Н. М. Брыфінг, спікер, саміт: Новыя запазычанні з англійскай мовы ў палітычнай сферы / Н. М. Даўгулевіч // Роднае слова. – 2002. – № 10. – С. 31.

Даўгулевіч, Н. М. Лайкра, скотч, хот-дог: Новая запазычаная лексіка пабытовай сферы / Н. М. Даўгулевіч // Роднае слова. – 2003. – № 6. – С. 40–42.

Даўгулевіч, Н. М. *Графіці, джакузі, караоке* – ён, яна, яно ці яны?: Род і лік нескланяльных запазычаных назоўнікаў / Н. М. Даўгулевіч, В. І. Уласевіч // Роднае слова. – 2005. – № 6. – С. 31–33; № 7. – С. 49–51.

Какорина, Е. В. Трансформация лексической семантики и сочетаемости (на материале языка газет) / Е. В. Какорина // Русский язык конца XX столетия (1985–1995). – М., 1996. – С. 67–89.

Костомаров, В. Г. Языковой вкус эпохи: Из наблюдений над речевой практикой масс-медиа / В. Г. Костомаров. – СПб., 1999.

Крысин, Л. П. Иноязычное слово в контексте современной общественной жизни / Л. П. Крысин // Русский язык конца XX столетия (1985–1995). – М., 1996. – С. 142–161.

Мальцева, Т. А. Французские заимствования в белорусском языке / Т. А. Мальцева. – Минск, 2004.

Новикова, Н. В. Культура использования заимствованных слов в функциональных разновидностях языка / Н. В. Новикова // Культура русской речи и эффективность общения. – М., 1996. – С. 375–396.

Панов, М. В. Из наблюдений над стилем сегодняшней периодики / М. В. Панов // Язык современной публицистики. – М., 1988.

Попова, Т. В. Неология и неография современного русского языка: учеб пос. / Т. В. Попова, Л. В. Рацибурская, Д. В. Гугунава. – М., 2005.

Сакун, Т. Роля “газетных слоўнічкаў” у засваенні беларускай мовай іншамоўнай лексікі ў 1930-я гг. / Т. Сакун // Роднае слова. – 2007. – № 12. – С. 37–39.

Современный русский язык: Социальная и функциональная дифференциация / Л. П. Крысин (отв. ред.). – М., 2003.

Станкевіч, А. А. Лексіка іншамоўнага паходжання ў беларускіх народных гаворках / А. А. Станкевіч. – Гомель, 1996.

Сцепанчук, Ю. А. Лексіка іншамоўнага паходжання ў сучанай беларускай паэзіі / Ю. А. Сцепанчук. – Мінск, 2002.

Уласевіч, В. І. Лексічныя працэсы ў беларускай мове 90-х гадоў XX ст.: дыс. ... канд. філал. навук / В. І. Уласевіч. – Мінск, 2002.

## Стылістычнае выкарыстанне лексікі пазалітаратурных пластоў у публіцыстычным маўленні

- Кантрастнае спалучэнне кніжнай, прастамоўнай і жаргоннай лексікі на старонках газет.
- Маладзёжны слэнг і яго адлюстраванне ў друку.

- Крыніцы фарміравання лексікі маладзёжнага слэнгу.
- Тэрміналагічнае поле ў даследаваннях маладзёжнага сацыялекту.
- Прафесійныя жаргоны і інтэржаргон (да пытання ўзаемадзеяння).
- Тэхніцызмы і камп'ютэрны жаргон: праблемы і перспектывы развіцця.
- "Сцёб" і прафесійны жаргон журналіста.
- Сацыяльныя дыялекты, іх моўныя асаблівасці і функцыянаванне ў тэкстах СМІ.
- Размоўная і прастамоўная лексіка ў тэлевізійным маўленні.
- Слэнгавая лексіка ў газетна-публіцыстычным і тэлевізійным дыскурсе.

*Літаратура*


Береговская, Э. М. Молодежный сленг: формирование и функционирование / Э. М. Береговская // Вопросы языкознания. – 1996. – № 3. – С. 32–42.

Бойко, Б. Л. Молодежный жаргон как отражение взаимодействующих субкультур / Б. Л. Бойко // Встречи этнических культур в зеркале языка: (в сопоставительном лингвокультурном аспекте). – М., 2002. – С. 352–361.

Большой словарь молодежного сленга / под ред. С. И. Левиковой. – М., 2003.

Васильев, А. Д. Крутой: к вопросу о формировании жаргонной лексики / А. Д. Васильев // Русская речь. – 1993. – № 6. – С. 44–47.

Веселовская, Т. М. Кто такие лохи? / Т. М. Веселовская // Русская речь. – 2001. – № 1. – С. 55–58.

Виноградова, Н. В. Компьютерный сленг и литературный язык: проблемы конкуренции / Н. В. Виноградова // Исследования по славянским языкам. – 2001. – № 6. – С. 203–216.

Ворон, О. В. Принципы лексикографического описания профессионального жаргона (на материале жаргона программистов) / О. В. Ворон // Термин и слово. – Новгород, 1997. – С. 143–147.

Горбаневский, М. В. Не говори шершавым языком / М. В. Горбаневский, Ю. Н. Караулов, В. М. Шаклеин. – М., 1999.

Грачев, М. А. В погоне за эффектом (блатные слова на газетной полосе) / М. А. Грачев // Русская речь. – 2001. – № 5. – С. 67–73.

Грачев, М. А. Откуда слова «тусовка» и «тусоваться»? / М. А. Грачев // Русский язык в школе. – 1995. – № 3. – С. 84–86.

Грачев, М. А. Третья волна / М. А. Грачев // Русская речь. – 1992. – № 4. – С. 61–65.

Григорьева, О. Н. Публицистический стиль в системе функциональных разновидностей языка / О. Н. Григорьева // Язык средств массовой информации: Учебное пособие для вузов / под ред. М. Н. Володиной. – М., 2008. – С. 355–365.

Диева, Т. М. Социальные диалекты в современной российской прессе (газеты «Завтра» и «Русский порядок»): автореф. дисс. … канд .филол. наук / Т. М. Диева. – СПб., 2001.

Ермакова, О. П. Источники пополнения жаргона / О. П. Ермакова // Русский язык. – 1999. – № 4. – С. 14–15.

Клушина, Н. И. Особенности публицистического стиля / Н. И. Клушина // Язык средств массовой информации: Учебное пособие для вузов / под ред. М. Н. Володиной. – М., 2008. – С. 479–495.

Костомаров, В. Г. Языковой вкус эпохи: Из наблюдений над речевой практикой масс-медиа / В. Г. Костомаров. – СПб., 1999.

Кронгауз, М. А. Русский язык на грани нервного срыва / М. А. Кронгауз. – М., 2007.

Крысин, Л. П. О лексике русского языка наших дней / Л. П. Крысин // Русский язык в школе. – 2002. – № 1. – С. 3–7.

Лихолитов, П. В. Компьютерный жаргон / П. В. Лихолитов // Русская речь. – 1997. – № 3. – С. 43–50.

Личковаха, Ю. В. Употребление ненормативной лексики в СМИ: языковой, этический и правовой аспекты / Ю. В. Личковаха // Журналистика в 2000 году: реалии и прогнозы развития: тезисы науч.-практ. конф., Москва, 2001. – М., 2001. – Ч. VII. – С. 26–28.

Лукашанец, Е. Г. Социальные диалекты в восточнославянский языках / Е. Г. Лукашанец. – Минск, 1993.

Михалкина, Т. А. Внелитературная лексика в языке произведений А. И. Солженицына: автореф. дисс. … канд. филол. наук / Т. А. Михалкина. – Минск, 2000.

Никитина, Т. Г. Молодежный сленг: толковый словарь / Т. Г. Никитина.– М., 2007.

Почему бизнесмены говорят как идиоты: перевод с англ. / Б. Фьюджер, Ч. Хардауэй, Д. Варшавски. – М., 2006.

Рожанский, Ф. И. Сленг хиппи / Ф. И. Рожанский. – СПб. – Париж, 1992.

Руденко, Е. Н. Вот вам и драг с дропом, или Компьютерный жаргон глазами лингвиста / Е. Н. Руденко // Славянский мир на пороге III тысячелетия: материалы междунар. науч. конф., Гомель, 15-16 мая 2001 г. – Гомель, 2001. – С. 241–243.

Скворцов, Л. И. Экология слова, или Поговорим о культуре русской речи / Л. И. Скворцов. – М., 1996.

Современный русский язык: Социальная и функциональная дифференциация / Л. П. Крысин (отв. ред.). – М., 2003.

Толкач, А. А. Маладзёжны слэнг // Культура мовы і грамадства: матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 5-6 снежня 2002 г. – Мінск, 2002. – С. 223–227.

Химик, В. В. Поэтика низкого, или Просторечие как культурный феномен / В. В. Химик. – СПб., 2000.

## СТЫЛІСТЫЧНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ТЭРМІНАЛОГІІ Ў ТЭКСТАХ СМІ

- Грамадска-палітычная тэрміналогія ў тэкстах СМІ.
- Сучасная эканамічная тэрміналогія ў аналітычных матэрыялах.
- Спецыфіка выкарыстання тэрміналогіі ў рэкламе.
- Дыпламатычная тэрміналогія і формулы маўленчага этыкету ў СМІ.
- Тэксты на эканамічныя тэмы ў семантычным і кагнітыўным аспектах: на матэрыялах СМІ.

*Літаратура*

Антанюк, Л. А. Спецыяльная лексіка беларускай мовы. Тэрміналогія: Вучэб. дапам. / Л. А. Антанюк. – Мінск, 2002.

Антанюк, М. Г. Рэцэпцыя рускіх юрыдычных тэрмінаў беларускай мовай / М. Г. Антанюк // Имя и слово (проблемы семантико-прагматического взаимодействия в славянских языках): материалы междунар. науч. конф.: В 2 ч. – Брест, 2007. – Ч. 2. – С. 3–7.

Гвоздович, Г. А. Функционирование номинативных единиц научно стиля в языке печатных СМИ / Г. А. Гвоздович // Мир русского слова и русское слово в мире: Материалы XI Конгресса междунар. ассоциации преподавателей русского языка и литературы. – Варна 17–23 сентября 2007 г. – Т.3. – С. 343–347.

Гвоздович, Г. А. О терминологических номинациях на страницах СМИ / Г. А. Гвоздович // Журналістыка–2006: Тэорыя. Практыка. Творчасць: Матэрыялы 8-й Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 85-годдзю Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вып. 8 / Рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) і інш. – Мінск, 2006. – С. 177–179.

Ефимов, Д. К. Терминосфера СМИ в русском и английском языках: автореф. дисс. … канд. филол. наук / Д. К. Ефимов. – Екатеринбург, 2005.

Ильин, М. В. Слова и смыслы. Опыт описания ключевых политических понятий / М. В. Ильин. – М., 1997.

Кавалёва, Л. Я. Англіцызмы ў тэрміналогіі сучаснай беларускай літаратурнай мовы: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук / Л. Я. Кавалёва. – Мінск, 2004.

Капейко, Т. В. Лексіка-семантычны спосаб тэрмінаўтварэнне / Т. В. Капейко. – Магілёў, 2007.

Кожина, Н. М. О диалогичности письменной научной речи / Н. М. Кожина. – Пермь, 1986.

Культура русской речи и эффективность общения. – М., 1996.

Літвін, Н. У. Беларуская эканамічная тэрміналогія і яе лексікаграфічная фіксацыя / Н. У. Літвін // Слово и словарь: сб. науч. трудов по лексикографии. – Гродно, 2007. – С. 67–70.

Лук’янюк, Ю. М. Сучасная беларуская філасофская тэрміналогія: Семантычны і структурны аспекты: дыс. ... канд. філал. навук / Ю. М. Лук’янюк. – Мінск, 2003.

Любецкая, К. П. Нямецка-беларуская лексікаграфія ХХ ст. і фарміраванне беларускай тэрміналогіі: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук / К. П. Любецкая. – Мінск, 2004.

Солганик, Г. Я. Стилистика текста: Учебное пособие / Г. Я. Солганик. – М., 2005.

Ступин, В. А. Инфолосоциолингвистика: методология, методика и техника исследования динамики терминологических процессов и предметных областей / Учебное пособие / В. А. Ступин. – СПб., 2000.

Терминология 3: изучение и обучение. Материалы Третьей междун. научно-практич. конф. 24–26 ноября 2005г. / ред. Т. И. Васильева, В. Г. Захарова, В. К. Щербин. – Минск, 2006.

Терминология власти: советские политические термины в историко-культурном контексте / Д. М. Фельдман. – М., 2006.

## СТЫЛІСТЫЧНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ПАСІЎНАЙ ЛЕКСІКІ Ў ТЭКСТАХ СМІ

- Аказіяналізмы ў тэкстах СМІ.
- Гістарызмы і архаізмы ў сучасных перыядычных выданнях.
- «Новыя» гістарызмы ў СМІ.
- Канфесійная лексіка ў СМІ.
- Лексіка-семантычныя неалагізмы ў сучасным публіцыстычным маўленні.
- Неалагізмы-запазычанні і іх беларускія эквіваленты ў публіцыстычным тэксце.
- Нетыповыя новаўтварэнні ў сучаснай публіцыстыцы.
- Новыя намінацыі як адлюстраванне засваення моўнай свядомасцю рэалій грамадскага жыцця.
- Складаныя намінацыі ў сучаснай публіцыстыцы.

*Літаратура*

Басава, Г. І. «Наталяю смагу словам сакавітым...»: Аказіянальнае слова і яго значэнне/ Г. І. Басава// Роднае слова. – 1995. – № 12.

Валгина, Н. С. Активные процессы в современном русском языке / Н. С. Валгина. – М., 2003.

Земская, Е. А. Активные процессы современного словопроизводства / Е. А. Земская // Русский язык конца XX столетия. – М., 1996. – С. 90–140.

Земская, Е. А. Словообразование как деятельность / Е. А. Земская. – М., 1992.

Зразікава, В. А. Семантычная і словаўтваральная структура індывідуальна-аўтарскіх неалагізмаў (на матэрыяле беларускіх мастацкіх твораў першай паловы XX ст.): дыс. ... канд. філал. навук / В. А. Зразікава. – Мінск, 2006.

Крысин, Л. П. Социолингвистические аспекты изучения современного русского языка / Л. П. Крысин. – М., 1989.

Лопатин, В. В. Рождение слова. Неологизм и окказиональные образования / В. В. Лопатин. – М., 1973.

Попова, Т. В. Неология и неография современного русского языка: учеб пос. / Т. В. Попова, Л. В. Рацибурская, Д. В. Гугунава. – М., 2005.

Страмной, А. В. Газетный текст как источник неологизмов: автореф. дисс. ... канд. филол. наук / А. В. Страмной. – Волгоград, 2007.

Тогоева, С. И. Психолингвистические проблемы неологии / С. И. Тогоева. – Тверь, 2000.

Уласевіч, В. В. Лексічныя працэсы ў беларускай мове 90-х гг. XX ст.: дыс. ... канд. філал. навук / В. В. Уласевіч. – Мінск, 2002.

Хромчанка, А. Р. Рэдактарскі аналіз вобраза аўтара-апавядальніка ў мастацкім тэксце // Жыццём і словам прысягаючы...: да 85-годдзя заслуж. работніка адукацыі Рэсп. Беларусь, д-ра філал. навук, праф. М. Я. Цікоцкага: Зб. навук. прац / пад агул. рэд., праф. В. І. Іўчанкава. – Мінск, 2007. – С. 279–283.

Шапошников, В. Н. Русская речь 1990-х. Современная Россия в языковом отображении / В. Н. Шапошников. – М., 1998.

**СТЫЛІСТЫЧНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ ФРАЗЕАЛАГІЧНЫХ АДЗІНАК**

- Трансфармацыя фразеалагізмаў у газетных загалоўках.
- Фразеалагічны каламбур у газетным загалоўку.
- Роля і месца фразеалагізмаў у тэкстах СМІ.
- Фразеалагізмы беларускай мовы з кампанентамі-саматызмамі (праблемы семантыкі і прагматыкі).
- Афарызм як фрагмент газетнага дыскурсу.
- Функцыянаванне фразеалагічных адзінак у мове газеты.

*Літаратура*

Алефиренко, Н. Фразеологическое значение: природа, сущность, структура / Н. Алефиренко // Грани слова: Сборник научных статей к 65-летию В. М. Мокиенко.– М., 2005.

Вакуров, В. Н. Основы стилистики фразеологических единиц / В. Н. Вакуров. – М., 1983.

Вакуров, В. Н. Фразеологический каламбур в современной публицистике / В. Н. Вакуров. – М., 1996.

Валгина, Н. С. Активные процессы в современном русском языке / Н. С. Валгина. – М., 2003.

Васильев, А. Д. От «новояза» – к «постновоязу» / А. Д. Васильев // Слово в российском телеэфире: Очерки новейшего словоупотребления. – М., 2003.

Вовчок, В. Н. Трансформация фразеологизмов как способ создания экспрессии (на материале газетных текстов) / В. Н. Вовчок // Проблемы

функционирования языка и специфики речевых разновидностей. – Пермь, 1982.
Даніловіч, М. А. Факультатыўнасць кампанентаў фразеалагізмаў / М. А. Даніловіч // Пісьменнік – мова – стыль: матэрыялы II Міжнар. нав. канф.: У 2-х т. – Мінск, 2002. – Т. I.
Демьянков, В. З. Конвенции, правила и стратегия общения / В. З. Демьянков // Известия АН СССР. Сер. «Литература и язык», 1982. – Т. 41. – Вып. 4. – С. 327–337.
Ермакова, О. П. Семантические процессы в лексике / О. П. Ермакова // Русский язык конца XX столетия (1985–1995). – М., 1996. – С. 32–66.
Земская, Е. А. Цитация и виды ее трансформации в заголовках современных газет / Е. А. Земская // Поэтика. Стилистика. Язык и культура. – М., 1996.
Зыкова, Е. И. К вопросу о специфике функционирования крылатых выражений в тексте / Е. И. Зыкова // Славянская фразеология и уровни языковой системы. – Гданьск, 2002.
Іваноў, Я. Я. Дыферэнцыяльныя прыметы афарызма: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук / Я. Я. Іваноў. – Мінск, 2004.
Коваль, В. И. Восточнославянская этнофразеология: деривация, семантика, происхождение. – Гомель, 1998.
Коваль, В. И. Славянская фразеология в арельном, историческом и этнокульутрном аспектах / В. И. Коваль. – Гомель, 2007.
Костомаров, В. Г. Языковой вкус эпохи: Из наблюдений над речевой практикой масс-медиа / В. Г. Костомаров – М., 1994.
Культурные слои во фразеологизмах и в дискурсивных практиках. – М., 2004.
Лазарева, Э. А. Газетный заголовок / Э.А. Лазарева. – Свердловск, 1989.
Лазарева, Э. А. Системно-стилистические характеристики газеты / Э. А. Лазарева. – Екатеринбург, 1993.
Лепешаў, І. Я. Пра варыянтнасць і сінанімічнасць у лексіцы і фразеалогіі / І. Я. Лепешаў, І. М. Хлусевіч // Весн. Гродзенскага дзярж. ун-та. Сер. 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія і сацыялогія. Культуралогія. Мастацтвазнаўства. Педагогіка. Псіхалогія. Правазнаўства. Філалогія. – 2000. – № 1. – С. 108–112.
Лепешаў, І. Я. Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы / І. Я. Лепешаў. – Мінск, 1984.

Лепешаў, І. Я. У слоўнікавую скрабонку: навуч. дапам. на спецкурсах «Праблемы фразеалагічнай стылістыкі» і «Прыказкі як моўныя адзінкі» / І. Я. Лепешаў. – Гродна, 1999.

Ляхова, Т. Н. Синтаксис фразеологической единицы / Т. Н. Ляхова. – СПб., 1992.

Ляшчынская, В. А., Шведава, З. У. Тыпалогія аўтарскіх фразеалагізмаў і іх мадэліраванне / В. А. Ляшчынская // Надзённыя праблемы лексікалогіі і анамастыкі славянскіх моў: зб. навук. прац. – Мазыр, 2006.

Максимов, В. И. Новая фразеология и ее использование / В. И. Максимов // Русский язык и культура речи / В. И. Максимов. – М., 2000. – С. 308–323.

Маршэўская, В. В. Фразеалагізмы са структурай сказа / В. В. Маршэўская. – Гродна, 2003.

Мелерович, А. М. Фразеологизмы в русской речи / А. М. Мелерович, В. М. Мокиенко. – М., 2001.

Михальчук, Н. Г. Фразеологические единицы как средство формирования идиостиля М. А. Булгакова: автореферат дисс. … канд. филол. наук / Н. Г. Михальчук. – Орел, 2002.

Мокиенко, В. М. Образы русской речи / В. М. Мокиенко. – СПб., 1999.

Муравьева, Н. В. Язык телевидения – язык улицы? / Н. В. Муравьева // Русская речь. – 2000. – № 3. – С. 46–51.

Мусин, И. Х. Психологический аспект изучения проблем речевого поведения / И. Х. Мусин // Текст в коммуникации. – М., 1991. – С. 127–136.

Савицкий, Н. П. Позитивное и негативное отражение общества в языке / Н. П. Савицкий // Словарь. Грамматика. Текст. – М., 1996.

Садоўская, А. С. Антанімічнасць фразеалагізмаў / А.С. Садоўская// Пісьменнік – мова – стыль: матэрыялы II міжнар. нав. канф.: У 2-х т. – Мінск, 2002. – Т. 1.

Санников, В. З. Русский язык в зеркале языковой игры / В. З. Санников. – М., 1999.

Солганик, Г. Я. Стилистический словарь публицистики / Г. Я. Солганик. – М., 1999.

Телия, В. Н. Русская фразеология: Семантические, прагматические и лингвокультурологические аспекты / В. Н. Телия. – М., 1996.

Фразеология в контексте культуры: сб. ст. / В. Н. Телия (отв. ред.). – М., 1999.

Хлусевіч, І. М. Варыянтнасць фразеалагізмаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове / І. М. Хлусевіч. – Гродна, 2002.

Шевченко, Г. И. Фразеологизмы античного происхождения в славянских языках / Г. И. Шевченко. – Минск, 2005.

## Выкарыстанне тропаў і фігур маўлення

- Метафара ў сучасным публіцыстычным маўленні.
- Прагматычная роля метафары ў публіцыстычным тэксце.
- Метафорыка навукова-папулярнага медыятэксту.
- Спецыфіка метафары як дыскурсаўтваральнага фактара.
- Метафара ў газетных загалоўках.
- Тэматычная ўніфікацыя метаніміі ў сучасным публіцыстычным маўленні.
- Метанімія ў газетным маўленні пачатку XX стагоддзя.
- Экспрэсія і стандарт у сучаснай публіцыстыцы.
- Кампаратыўныя тропы як носьбіты фонавай інфармацыі (супастаўляльны аспект).
- Перыфраз як экспрэсіўны сродак мовы газеты (семантычна-прагматычны аспект).
- Газетнае параўнанне.

*Літаратура*

Арутюнова, Н. Д. Метафора / Н. Д. Арутюнова // Лингвистический энциклопедический словарь. – М., 1990.

Арутюнова, Н. Д. Функциональные типы языковой метафоры / Н. Д. Арутюнова. – М., 1978.

Баранов, А. Н. Русская политическая метафора (материалы к словарю) / А. Н. Баранов, Ю. Н. Караулов. – М., 1991.

Политический дискурс: методы анализа тематической структуры и метафорики / А. Н. Баранов, О. В. Михайлова, Г. А. Сатаров, Е. А. Шипова. – М., 2004.

Беззубов, А. Н. Семантические приемы газетной речи / А. Н. Беззубов. – СПб., 2000.

Бессарабова, Н. Д. Изобразительные и выразительные возможности метафор в газетно-публицистической речи / Н. Д. Бессарабова. – М., 1985.

Горбач, В. А. Метанімія ў публіцыстычным маўленні (парадыгматычныя здольнасці і сінтагматычная неабходнасць): аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук / В. А. Горбач. – Мінск, 2000.

Грехнева, Л. В. Перифраза и смежные лингвистические явления / Л. В. Грехнева // Термин и слово. – Н. Новгород, 1997.

Гудков, Л. Д. Метафора и рациональность / Л. Д. Гудков. – М.,1994.

Ермакова, О. П. Семантические процессы в лексике / О. П. Ермакова // Русский язык конца XX столетия (1985–1995). – М., 1996. – С. 32–66.

Карпова, Н. С. Роль метафоры в развитии лексико-семантической системы языка и языковой картины мира (на материале английских и русских неологизмов): автореф. дисс. ... канд. филол. наук / Н. С. Карпова. – Саратов, 2007.

Королёва, О. Э. Метонимия как тип значения: семантическая характеристика и сферы употребления / О. Э. Королёва. – Обнинск, 2002.

Костомаров, В. Г. Тексты в масс-медиа / В. Г. Костомаров // Журналистика и культура русской речи. – 2004. – № 2. – С. 4–40.

Красней, В. П. Грані слова: факультатыўны курс "Лексіка і фразеалогія беларускай мовы": вучэб. дапам. – Мінск, 1996.

